УДК 624.21

# ПЕШАХОДНЫ МОСТ ПРАЗ МКАД, КАЛЯ КАМЕННАЙ ГОРКІ

***Булынко Вікторыя Яўгенаўна****, студэнт 1-га курса кафедры "Масты і тунэлі»*

*Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт, г. Мінск*
*(Навуковы кіраўнік - Касцюковіч В.В., асістэнт)*

Пасёлак Тарасава вельмі блізка размешчаны да Мінска, што амаль з любой яго вуліцы бачныя шматпавярхоўкі сталічнага мікрараёна Каменная Горка. Мясцовыя жыхары, у якіх няма машын, ездзілі ў горад на аўтобусе № 36, што ідзе з пасёлка ў сталічны мікрараён Кунцаўшчына. Пешшу праз кальцавую было не прасунуцца.

Праблему пешаходнай сувязі вырашылі. Будаўніцтва пешаходнага моста паміж Мінскам і вёскай Тарасава завяршылася 26.08.2016.



Рисунок 1

Даўжыня моста разам з падыходамі - 80 м, шырыня - 3,6 м. Спецыялісты, якія ўзводзілі аб'ект, пакінулі яго па-англійску: без разразання чырвонай стужачкі і афіцыйнага адкрыцця. Але жыхарам Каменнай Горкі і вёскі Тарасава асаблівых цырымоній і не трэба было. Яны ўжо наладзілі актыўны трафік паміж населенымі пунктамі: павольна прагуліваюцца сямейныя пары з каляскамі, моладзь, пралятаюць веласіпедысты. Мост стаў не проста пераправай з аднаго боку кальцавой на іншую, але і месцам адпачынку. З кожнага боку канструкцыі ёсць круглыя пляцоўкі з лаўкамі, дзе можна пасядзець. А крыху далей - яшчэ

Репозиторий БНТУ

пара назіральных балкончыкаў. З вышыні, як на далоні, бачна бліжэй размешчаная мясцовасць, праязжаючыя праз МКАД аўтамабілі.



Рисунок 2

У моста два спуску. З боку вёскі ён больш высокі, таму яго падзялілі на дзве часткі. На адной абсталяваны прыступкі, на іншай - пандус з поручнямі, каб было зручна падняцца або спусціцца людзям на інваліднай калясцы. Так як вугал нахілу спуску з боку вуліцы Казіміраўскай невялікі, то тут такога занавання няма.

Паабапал пуцеправода ўстаноўлены ліхтары. Акрамя таго, у парэнчы моста ўмантавана святлодыёднае абсталяванне. Але палюбавацца ілюмінацыяй ў цёмны час сутак пакуль немагчыма, яна не гарыць. Канешне, пасля заходу сонца тут не пануе апраметны змрок. Мост пападае ў зону дзеяння асвятляльных мачтаў кальцавой дарогі.

Літаратура:


1. http://realty.tut.by/news/building/488548.html
2. http://m.minsknews.by/sm/?sim=402356
3. https://auto.onliner.by/2016/07/09/most-9
4. http://www.ctv.by/novosti-minska-i-minskoy-oblasti/v-minske-otkryli-peshehodnyy-most-mezhdu-kamennoy-gorkoy-i-tarasovo


Репозиторий БНТУ